**ПАСХАЛЬНАЕ ПАСЛАННЕ**
**Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі КІРЫЛА**
**архіпастырам, пастырам, дыяканам, манахам**
**і ўсім верным дзецям Рускай Праваслаўнай Царквы**

**Узлюбленыя ў Госпадзе Праасвяшчэнныя архіпастыры,**
**пачэсныя прасвітары і дыяканы, богалюбівыя інакі і інакіні,**
**дарагія браты і сёстры!**

Духоўна святкуючы гэтую вялікую і слаўную падзею Уваскрасення з мёртвых Спасіцеля свету, у думках сузіраючы Яго паўстанне з гробу, звяртаю да ўсіх вас жыццесцвярджальны, напоўнены ўнутранай сілай, непераможнай праўдай і радасцю вокліч:

**ХРЫСТОС УВАСКРЭС!**

Светлазарная пасхальная ноч яўляе чалавецтву паўнату Божай любові, паводле якой прадвечны Сын Нябеснага Айца прыняў на Сябе чалавечую прыроду, ацаліў яе ад хваробы граху і, сышоўшы ў пякельныя глыбіні, знішчыў кайданы смерці, дараваўшы нам бясцэнную магчымасць адзінства са сваім Стваральнікам і Прамысліцелем.

Далучаючыся да гэтай усёпакрываючай любові Госпада, мы знаходзім непераможную зброю *"супраць уладароў цемры веку гэтага, супраць духаў злобы паднябеснай"* (Эф. 6, 12). Мы пераадольваем страх, выкліканы абмежаванасцю нашай чалавечай прыроды, і знаходзім здольнасць бязбоязна глядзець у твар любым выклікам часу. Бо *"ў любові няма страху, а дасканалая любоў праганяе страх"* (1 Ін. 4, 18).

Невыпадкова Евангелле шмат разоў абвяшчае нам словы Госпада, якія вымаўляюцца Ім для падбадзёрвання, умацавання духу Сваіх паслядоўнікаў: *"Не бойся!"* Страх перад будучыняй, боязь небяспек, невядомых, уяўных ці рэальных пагроз — гэта пачуццё, знаёмае многім. Але Гасподзь знаходзіцца з намі, калі толькі мы самі не адпрэчваемся ад Яго. І ў дні праслаўлення Яго перамогі над смерцю Спасіцель зноў заклікае кожнага з нас: *"Не бойся, толькі веруй!"* (Мк. 5, 36).

Няхай нашы паводзіны, якія супярэчаць спакусліваму духу веку гэтага, стануць бачным пацверджаннем Праўды Вечнай. Бо хоць мы і знаходзімся цяпер ва ўмовах грамадскай і рэлігійнай свабоды, але імкненне жыць у адпаведнасці з хрысціянскімі маральнымі нормамі па-ранейшаму азначае рух супраць плыні. Яно выяўляе нязгоду з тымі стэрэатыпамі паводзін і пазіцыяй

апраўдання граху, якія настойліва і сістэмна ўкараняюцца ў жыццё людзей праз сучасныя сродкі ўздзеяння на свядомасць.

Звярнуўшыся да Госпада, мы зможам выбрацца з духоўнай пустэчы і пануючага ў свеце эгаізму, убачыць святло Уваскрасення, успрыняць яго як пуцяводны арыенцір у шэсці да Нябеснага Горада.

Крыніцай сіл у гэтым руху да вечнасці няхай стане для нас далучэнне да адзінай Еўхарыстычнай чашы. Няхай умацуе нас благадаць Усесвятога Духа, даруючы нашым душам неад'емны мір, стойкасць у веры, узрастанне ў дабрадзейнасцях.

Прычашчаючыся Цела і Крыві Хрыстовых, мы, паводле слова Свяшчэннага Пісання, становімся *"прычаснікамі Божай прыроды"* (2 Пят. 1, 4), здольнымі перамяніць свой прыродны стан. Праз Прычасце мы атрымліваем магчымасць стаць ва ўсім падобнымі на Таго, Хто дзеля нас *"прынізіў Сябе Самога, прыняўшы аблічча раба, зрабіўшыся падобным да людзей і па выгляду стаўшы як чалавек; змірыў Сябе, быўшы паслухмяным нават да смерці, і смерці крыжовай"* (Флп. 2, 7-8).

Маральная, духоўная перамена самога сябе з’яўляецца галоўнай умовай і падставай для перамянення жыцця грамадства, народа, краіны. Немагчыма змяніць да лепшага цэлае, не ўдасканальваючы яго частак. Станоўчая настроенасць думак людзей усіх узроставых, сацыяльных і палітычных груп непасрэдна вызначае дабрабыт Айчыны. Ад таго, якімі будуць нашы жыццёвыя вектары, залежыць шлях развіцця ўсіх дзяржаў гістарычнай Русі, Царквы нашай, а ў выніковым значэнні — і ўсяго тварэння Божага, ручанага нам Стваральнікам, каб берагчы і *"захоўваць яго"* (Быц. 2, 15).

Малітоўна жадаю ўсім вам, дарагія мае, неаслабнага знаходжання ў радасці аб Уваскрэслым Пераможцу пекла і шчодрай дапамогі звыш у вашай паўсядзённай працы.

**САПРАЎДЫ ЎВАСКРЭС ХРЫСТОС!**

Амінь.

**+КІРЫЛ,**

**ПАТРЫЯРХ МАСКОЎСКІ І УСЯЕ РУСІ**

*Масква,*
*Пасха Хрыстова*
*2012 г.*